


Васіль Зуёнак – адзін з самых вядомых сучасных беларускіх паэтаў пакалення «шасцідзесятнікаў», на плечы якіх сёння надзейна абапіраецца ўвесь шмат'ярусны гмах нацыянаяьнай літаратуры. Яны здолелі з немалым поспехам праявіць сябе ва ўсіх яе відах і жанрах.

MyShared



Як становяцца паэтамі? Кажуць, што паэтамі нараджаюцца. Магчыма. Васіль Зуёнак— адзін з самых вядомых сучасных беларускіх паэтаў — адказвае на гэта пытанне так:

***З табою не спраўлялі***
***мы заручын,***
***Сватоў не засылаў я.***
***Ты сама***
***Прыйшла аднойчы***
***песняю нягучнай...***
***І з хвілі той спакою***
***мне няма...***

MyShared



**Васіль Васільевіч Зуёнак** нарадзіўся 3 чэрвеня 1935 г. у вёсцы Мачулішча Крупскага раёна Мінскай вобласці у сялянскай сям'і. Бацькі працавалі па гаспадарцы — аралі, сеялі, збіралі ўраджай. Сын спасціг сялянскую навуку рана, быў і пастушком, і касцом, і аратым, і малацьбітом.

***Касіць? Давай. Араць?***
***Будзь ласкаў: Трымала плуг рука мая...***
***У пяць цапоў — не ў ладкі — пляскау***
***У тым, сорак чацвёртым, я.***

*(«На сэрцы — неспакою камень...»)*

Паэзію не выбіраюць — яна сама выбірае. З Васілём Зуёнкам гэта здарылася яшчэ ў школьныя гады, калі свет упершыню адкрыўся перад ім у сваім першародным бляску і хараstве, натуральнасці фарбаў жыццёвай прыгажосці, прымусіў дзівіцца зямной красе.

MyShared

# Жыццёвы шлях паэта

**Пару дзяцінства азмрочыла вайна, якая потым не раз адгукнецца ў творах. Яна пакінула трагічны след у душы на ўсё яго астатняе жыццё...**

**Да вайны пайсці ў школу не давялося, але чытаць і пісань навучыўся рана, яшчэ да школы. У 1944 г. прыйшло вызваленне, расчыніла дзверы Мачулішчанская пачатковая школа, якую Васіль Зуёнак скончыў фарсіраваным тэмпам —за два гады. Тады ж захапіўся паэзіяй, пачаў пісаць вершы сам. Тыя, каму юны паэт адважыўся паказаць свае першыя «спробы пяра», раілі вучыцца.**

**Пасля заканчэння Узнацкай сямігодкі бацька Васіль Захаравіч адвёз сына ў Барысаў — там было педвучылішча. На развітанне даў некалькі чырвонцаў. У Барысаве творчая дзейнасць маладога паэта працягвалася далей. Тут ён убачыў свае вершы надрукаванымі ў раённай газеце. Скончыўшы педвучылішча, з дыпломам выдатніка, ён апынуўся ў Мінску на аддзяленні журналістыкі Белдзяржуніверсітэта і з самага пачатку універсітэцкай вучобы трапіў у літаратурнае асяроддзе, жыў у адным інтэрнаце з будучымі пісьменнікамі:Вячаславам** *Адамчыкам, Міколам Арочкам, Рыгорам Барадуліным, Сымонам Блатуном, Генадзем Бураўкіным, Анатолем Вярцінскім, Леанідам Гаўрылкіным, Нілам Гілевічам, Віктарам Карамазавым, Арсенем Лісам, Міхасём Стральцовым, Барысам Сачанкам.*

MyShared

# *Савецкі перыяд творчасці*

**Пасля заканчэння ў 1959 г. універсітэта малады журналіст пайшоў працаваць у газету «Рабочае юнацтва», а затым «Піянер Беларусі». З 1966г. па 1972г. – намеснік галоўнага рэдактара часопіса “Маладосць”. З 1972г. – галоўны рэдактар часопіса “Бярозка”. Быў членам КПСС. З’яўляецца кандыдатам філалагічных навук.**







MyShared

# Паэзія для дзяцей

Праца ў дзіцячых выданнях абудзіла ў ім захапленне паэзіяй для дзяцей, і ён сам пачаў для іх пісаць. Пачалі выходзіць кнігі «Вясёлы калаўрот» (1965). «Жылі-былі пад вадой» (1969), «Сонечны клубочак» (1974).







***Вы не бачылі, сябры, —***
***Зоркі выпалі у бары.***
***Дзе ні глянеш,***
***на паляне —***
***Усё гарыць чырвоным***
***ззяннем***
***Пад лістамі, ля***
***пянькоў—***
***Сотні зыркіх аганькоў.***

MyShared




**Зуёнак пісаў выдатныя вершы для дзяцей.** «Бадзірог»

*Бадзірог, Бадзірог —*
*Не пускае за парог:*
*Дзеці ў хаце туляцца,*
*А ён— ідзе па вуліцы,*
*Бэкае і мэкае,*
*Ледзь не кукарэкае,*
*Уцякайце — хто куды*
*Ад рагатае бяды!..*
*Раптам бачыць Бадзірог*
*Новыя вароты —*
*І з усіх чатырох,*
*І з усёй ахвотай:*
*«Што — хіба я не*
*баран?!» —*
*Паімчаўся на таран!*
*Ну а потым —*
*Што было там? —*
*Зараз вам усё скажу:*
*Дзве прабоіны ў варотах*
*І аўчынка на кажух.*

MyShared

**Першы зборнік** «дарослай» лірыкі «Крэсіва» з'явіўся ў 1966 г. Ён адкрываўся наступным вершам:








Мільёны год.
мільёны год
Да сонца
З цемсні ірвуся.
Мільёны год,
мільёны год
Іду.
Іду —
І не спынюся
На ніве смерці і жыцця
Мне вечна юным бышь аратым.
Бо ўсіх пачаткаў
Я — працяг
Усіх працягаў
Я — пачатак.

MyShared

Паэзія В. Зуёнка рознымі шляхамі, але ўвесь час развіваецца па лініі ўзбагачэння духоўнага свету лірычнага героя. **Лірыка кахання** дапамагае глыбей і паўней адчуць і пазнаць багацце душы і прыгажосць чалавечых адносін у іх унутранаіі паўнаце і шматграннасці. Сюды можна аднесці такія вершы як “Абяцаю ночы бяссонныя...”, “Нахіляўся, як дзікі лясун...”, “Аднойчы” і інш.

*Буду*
*садам тваім па вясне.*
*Буду*
*ў полі сцяжынкан забытай:*
*Перапёлка*
*на золку засне —*
*Прыбягай дажынаць сваё жыта*
*Буду*
*цёплаю муравой*
*На тваіх лугах-сенажацях.*
*Буду*
*ў Нёмана сіні сувой.*
*Як русалку, цябе спавіваць я.*
*Буду*
*раніцай легкім дымком*
*Над страхой тваёй віцца ў просінь.*
*Буду*
*ціхім дамавіком*
*Сны жаданыя ў хату прыносіць."'*
*« Не бяжы, не уцячэш ад сябе...»*







MyShared

# Тэма вайны ў творчасці В.Зуёнка

Сялянская аснова не звужае грамадскія далягляды паэта, не аддзяляе яго ад іншых. З іншымі яго лучыць якраз асабіста перажытае і выпакутаванае.

Гаворка ідзе пра нястачы **ваеннай пары** , вядомыя аўтару не з чужых вуснаў. Асабісты вопыт абумовіў яскравую вобразнасць, незвычайнае багацце мовы, канкрэтыку і эмацыянальнасць.
Тэма народных выпрабаванняў у гады вайны прысутнічае ў яго творчасці, пачынаючы з самых першых вершаў. Вайна са сваім трагізмам і героікай, драматызмам і самаадданай барацьбой народа за жыццё фарміравала светаўспрыманне паэта і ў многім вызначыла яго сучасны погляд на рэчы.

***Я знаю хлеб.***
***Было ладункаў! —***
***З сурэпкай, з конскім шчаўлюком.***
***З карой, з чырвонаю мядункай***
***Ды з жалудовым крупчаком***
***З сухой скарынкаю ваеннай.***
***Што, як шынелік той, — лубком,***
***З бензінным духам пасля змены,***
***З вясельным сонечным хмяльком...***
***Пракіслы, ёлісты. гаркавы —***
***За усё на свеце саладзей...***

MyShared

Асаблівая пяшчота да маці тых, хто не вярнуўся з вайны: муж, адзіны сын... Гэтыя пачуцці цяжка перадаць, але В.Зуёнак па-майстэрску перадае іх і ў радках гучыць абяцанне не страціць здабытае нашымі продкамі. У якасці прыкладаў можна прывесці наступныя вершы: “З вайны сустрэлі мацяркі сыноў...”, “Бо наваліўся б лістабой у маі...”, “Помнік” і інш.



## Прэміі і ўзнагароды:

- Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1974) за кнігу вершаў «Сяліба»
- Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы (1982) за паэму «Маўчанне травы».









**Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга**

MyShared




Паэзія В. Зуёнка – цікавая, смелая, глыбокая – круты палявы замес, настоены на багатым душэўным вопыце паэта. Тут знайшоў глыбокае адлюстраванне наш складаны век, перашыванні сучасніка, суровая памяць вайны, узаемасувязь асобы, прыроды і грамадства, працоўная мараль і этыка сённяшняга чалавека, выявілася схільнасць паэта да маштабнага, асацыятыўна-ўзбуйнёнага вобраза, яркіх фарбаў і колераў. У метафары "праўда зерня", да якой звяртаецца паэт, закладзена сутнасць яго мастакоўскай канцэпцыі, успрыманне свету, цікавасць да вытокаў, імкненне глядзець у корань.

MyShared

# СПАСИБО ЗА ВНИМАНИЕ!